Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
________С. Л. Шпарло
"21" чэрвеня 2024 г.
Рэгістрацыйны № ВД- 6-115 /вуч.

# ГЕРАЛЬДЫКА

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2024

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-01-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбнага планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК:**
І. Н. Колабава, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*П.С.Курловіч,* загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*М. М. Елінская*, вядучы рэферэнт аддзела арганізацыйнай работы, інфармацыі і выкарыстання дакументаў Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №6 ад 25.01.2024);
Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 10.04.2024)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Геральдыка” прызначана для студэнтаў спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)”.

Мэта выкладання вучэбнай дысцыпліны «Геральдыка» – сфарміраваць у студэнтаў першасныя прафесійныя кампетэнцыі ў сферы гісторыі ўзнікнення і фарміравання тэрытарыяльных і прыватнаўласніцкіх гербоў, фарміравання дзяржаўнай сімволікі, накіраваць іх на арганізацыю самастойнай работы па стварэнні і даследаванні музейнай геральдычнай калекцыі, а таксама выкарыстанне атрыманых ведаў у турыстычнай дзейнасці.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Геральдыка” спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Актуальнасць дадзенай вучэбнай дысцыпліны вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны «Геральдыка» акрэслівае шэраг задач:

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця тэрытарыяльных і прыватнаўласніцкіх гербоў на тэрыторыі Беларусі;

– выявіць характэрныя асаблівасці сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі на прыкладзе геральдычных калекцый.

– выпрацаваць у студэнтаў уменні па апрацоўцы атрыманай інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” прадугледжана фарміраванне наступнай кампетэнцыі:

СК – 4 Прымяняць метады і дасягненні археалогіі, рэлігіязнаўства і спецыяльных гістарычных дысцыплін для выяўлення, крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі музейных крыніц, вызначэння агульнага і асаблівага ў развіцці сусветных рэлігій.

СК – 5 Планаваць і выконваць работу па бягучаму і перспектыўнаму камплектаванню музейных калекцый, іх уліку і выкарыстанню ў экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці ў адпаведнасці з прававымі нормамі і прынцыпамі музейнай этыкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Геральдыка” студэнты павінны *ведаць*:

– прадмет даследавання спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны “Геральдыка”;

– прыёмы даследавання ў дадзеным кірунку;

– методыку самастойнай работы з крыніцай і апрацоўкі інфармацыі;

– гістарычныя ўмовы развіцця геральдыкі;

– методыку выкарыстання набытых ведаў у музейнай і турыстычнай працы;

– навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне.

Студэнты павінны *ўмець*:

– выкарыстоўваць прыёмы і метады спецыяльных гістарычных дысцыплін;

– выкарыстоўваць даныя спецыяльных гістарычных дысцыплін пры правядзенні практычнай і навуковай работы;

– праводзіць навуковую апрацоўку музейных калекцый;

– выкарыстоўваць інфармацыйныя крыніцы ў музейнай працы;

– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Студэнты павінны а*валодаць*:

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;

– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме вучэбнай дысцыпліны.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах, якіх знаходзяцца геральдычныя калекцыі.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны "Геральдыка" выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп'ютарныя тэхналогіі.

Для кіравання адукацыйным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Геральдыка" распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з вучэбнымі праграмамі іншых вучэбных дысцыплін спецыяльнасці ("Археалогія", "Этналогія Беларусі", "Гісторыя Беларусі" і інш.).

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне вучэбнай дысцыпліны "Геральдыка" прадугледжана ўсяго 100 гадзін, аўдыторных – 50 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 30 гадзін – лекцыі, 20 гадзін – семінарскія заняткі. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне. Форма правядзення прамежкавай атэстацыі – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны. Прадмет, задачы і крыніцы геральдычных даследаванняў. Гістарыяграфічны агляд

Вызначэнне геральдыкі як навуковай дысцыпліны. Этымалогія тэрмінаў герб, геральдыка. Прадмет вывучэння геральдыкі і яе задачы. Крыніцы геральдычных даследаванняў. Геральдыка тэарэтычная і практычная. Сувязь геральдыкі з іншымі спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі (генеалогія, сфрагістыка, нумізматыка і інш.).

Гістарыяграфічны агляд развіцця геральдычных даследаванняў.

## Тэма 1 Герб. Складовыя часткі герба

Паходжанне гербоў. Функцыі герба (рэпрэзентатыўная і распазнавальная). Класіфікацыя гербоў. Гербы фізічных асоб (родавыя, прыватныя, асабістыя, сямейныя). Тэрытарыяльныя гербы.

Геральдычныя калекцыі.

Складовыя часткі герба: шчыт, шлем, начэлле, нашлемнік, карона, намітка, шчытатрымальнікі, дадатковыя аздобы, стужка, дэвіз, мантыя, засень.

Шчыт. Форма, поле. Падзелы поля шчыта.

Металы, футры, колеры (эмалі, фарбы, фініфці). Метад умоўнай штрыхоўкі.

Выявы на шчыце. Геральдычныя (канстантныя і другасныя) і негеральдычныя (натуральныя, штучныя, фантастычныя) фігуры.

Выкарыстанне спецыяльнай геральдычнай тэрміналогіі.

Сімволіка колераў, металаў, футраў, негеральдычных фігур.

Шлем. Размяшчэнне. Віды.

Начэлле. Размяшчэнне. Прызначэнне.

Нашлемнік. Размяшчэнне. Віды.

Карона. Размяшчэнне. Віды. Шапка, тыяра, чалма, капялюш.

Намітка. Размяшчэнне. Асаблівасці знешняга выгляду.

Шчытатрымальнікі. Размяшчэнне. Віды і асаблівасці.

Дадатковыя аздобы. Размяшчэнне. Прызначэнне.

Стужка. Размяшчэнне. Прызначэнне.

Дэвіз. Размяшчэнне. Змест. Мова.

Мантыя. Размяшчэнне. Асаблівасці знешняга выгляду.

Засень. Размяшчэнне. Прызначэнне.

## Тэма 2 Асноўныя правілы распрацоўкі і апісання гербоў

Правілы састаўлення гербоў. Выпадкі змены гербавых фігур.

Апісанне гербоў (паслядоўнасць, выкарыстанне спецыяльных тэрмінаў).

Апісанне шчыта (форма, падзелы, пакрыццё палёў, фігуры, іх размяшчэнне і інш.).

Апісанне неабавязковых элементаў герба.

## Тэма 3 Прыватнаўласніцкія і тэрытарыяльныя гербы на беларускіх землях ў XIV–XVIII стст.

Асноўныя этапы развіцця геральдыкі Вялікага Княства Літоўскага. Узнікненне і развіццё прыватнаўласніцкіх гербоў у Вялікім Княстве Літоўскім. Дагербавыя выявы (клейны). Рунічная тэорыя. Гарадзельская ўнія 1413 г. Гербы шляхты Вялікага Княства Літоўскага.

Тэрытарыяльныя гербы – ваяводскія, губернскія і гарадскія. Гарадскі герб як сімвал самастойнасці. Класіфікацыя выяў на гарадскіх гербах.

Гербы цэхаў і канфесіянальна-асветніцкіх рэлігійных брацтваў. Мяшчанскія гербікі.

Паходжанне герба "Пагоня". Герб "Пагоня" – помнік гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Разнастайнасці герба "Пагоня". Пісьмовыя і сфрагістычныя матэрыялы аб працэсе пераўтварэння тэрытарыяльнага герба "Пагоня" ў дзяржаўны герб Вялікага Княства Літоўскага. Герб "Пагоня" ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Выкарыстанне герба "Пагоня" у сучаснай тэрытарыяльнай геральдыцы Рэспублікі Беларусь.

## Тэма 4 Геральдыка Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

Агульны агляд станаўлення і развіцця расійскай геральдыкі ў XVIII – пачатку XX ст. Крыніцы і даследаванні па расійскай геральдыцы.

Заснаванне Геральдмейстарскай канторы (1722). "Общий дворянских родов гербовник" (1797). Класіфікацыя дваранскіх расійскіх гербоў. Фарміраванне дзяржаўных сімвалаў. Гарадская геральдыка.

Развіццё геральдыкі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

Губернскія і гарадскія гербы.

## Тэма 5 Геральдыка Беларусі ў 1918–1991 гг.

Абвяшчэнне незалежнасці БНР (25 сакавіка 1918 г.). Дзяржаўная сімволіка БНР.

Абвяшчэнне БССР (1 студзеня 1919 г.). Герб БССР. Абвяшчэнне Літоўска-Беларускай ССР (27 лютага 1919 г.). Герб Літоўска-Беларускай ССР. Аднаўленне БССР (31 ліпеня 1920 г.).

Зацвярджэнне Дзяржаўнага герба БССР VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў (11 красавіка 1927 г.). Унясенне змен у герб у 1938–1939, 1958 гг.

Герб СССР. Абвяшчэнне СССР (30 снежня 1922 г.). Зацвярджэнне ЦВК Дзяржаўнага герба і сцяга СССР (6 ліпеня 1923 г.). Канстытуцыя СССР 1924 г. Змены ў савецкім гербе ў 1936, 1946, 1956 гг.

## Тэма 6 Геральдыка Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст.

Прыняцце Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР (27 ліпеня 1990 г.).

Прынццце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь Законаў “Аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь”, “Аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь” (19 верасня 1991 г.).

Рэферэндум 14 траўня 1995 г. Прыняцце новага дзяржаўнага герба і флага Рэспублікі Беларусь.

Геральдычны Савет пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2002).

Сучасная тэрытарыяльная геральдыка Беларусі. Гербы адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Беларусі. Класіфікацыя беларускіх гарадскіх гербаў

Дзяржаўны геральдычны рэгістр Рэспублікі Беларусь.

Закон Рэспублікі Беларусь “Аб афіцыйных геральдычных сімвалах” (2012 г.)

**Тэма 7 Вексілалогія (агульны агляд)**

Вызначэнне вексілалогіі як навуковай дысцыпліны. Прадмет, задачы і крыніцы вексілалагічных даследаванняў. Этымалогія тэрмінаў вексілалогія, сцяг, флаг.

Функцыі сцяга, флага. Класіфікацыя сцягоў, флагаў.

Складовыя часткі сцяга, флага. Сцягавы комплекс.

Заканадаўчая база і агульныя прынцыпы стварэння сцяга, флага.

Вексілалагічныя калекцыі.

Гісторыя дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь.

# ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1. | Уводзіны.<br>Прадмет, задачы і крыніцы геральдычных даследаванняў. Гістарыяграфічны агляд | 2 | | | |
| 2. | Тэма 1 Герб. Складовыя часткі герба | 6 | 6 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 3. | Тэма 2 Асноўныя правілы распрацоўкі і апісання гербоў | 2 | 4 | | |
| 4. | Тэма 3 Прыватнаўласніцкія і тэрытарыяльныя гербы на беларускіх землях у XIV–XVIII стст. | 4 | 4 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 5. | Тэма 4 Геральдыка Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. | 2 | | | |
| 6. | Тэма 5 Геральдыка Беларусі ў 1918–1991 гг. | 2 | | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 7. | Тэма 6 Геральдыка Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. | 4 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 8 | Тэма 7 Вексілалогія (агульны агляд) | 2 | | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| Разам | | 24 | 16 | 10 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура

1. Вспомогательные исторические дисциплины [Электронный ресурс]: [учеб.] : / Г. А. Леонтьева, П. А. Шорин, В. Б. Кобрин ; под ред. Г.А. Леонтьевой. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : ВЛАДОС, 2015. – 380. – https://biblioclub.ru/index.php?page=book_red&id=429883.

2. Специальные исторические дисциплины: учеб. пособие / М. М. Кром [и др.]; сост. М. М. Кром. – 2-е изд., испр. – СПб : Дмитрий Буланин, 2003. – 638 с.

3. Цітоў, А. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі: курс лекцый / А.Цітоў. – Мінск: Метад.-выд. цэнтр РІВШ БДУ, 1999. – 175 с.

### Дадатковая літаратура

1. Аб афіцыйных геральдычных сімвалах: Закон Респ. Беларусь, 26 траўня 2012 г., № 384-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2012. – № 63, 2/1936.

2. Аб зацвярджэнні эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Палажэння аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь // Збор указаў прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь. – 1995. – № 17. – С. 7 – 10.

3. Адамушко, В.И. Гербы и флаги Беларуси / В.И.Адамушко, М.М.Елинская. – Мінск: Беларусь, 2006. – 253 с.

4. Адамушко, В.И. Современная геральдика Беларуси / В.И. Адамушко, М.М.Елинская. – Мінск: БелЭн, 2012. – 536 с.

5. Бурков, В.Г. Государственная геральдика и вексилология: Россия, СНГ, Европа, Америка / В.Г.Бурков. – СПб.: Эго, 2004. – 472 с.

6. Васільеў, Я. Як ствараўся герб БССР / Я.Васільеў, М.Камінскі // Маладосць. – 1970. – № 1. – С. 93–97.

7. Винклер, П.П. фон. Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи. [Репринт. воспроизведение изд. 1890 г.] / П.П. фон Винклер. – М.: Планета, 1991. – 222 с.

8. Кобрин, В.Б. Вспомогательные исторические дисциплины / В.Б.Кобрин, Г.А.Леонтьев, Р.А.Шорин. – М.: Просвещение, 1984. – 208 с.

9. Цітоў, А. Геральдыка беларускіх месцаў/ А.Цітоў. – Мінск: Полымя, 1998. – 284 с.

10. Цітоў, А. Пячаткі старажытнай Беларусі / А.Цітоў. – Мінск: Полымя, 1993. – 239 с.

11 Цітоў, А. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі / А.Цітоў. – Мінск: Метад.-выд. цэнтр РІВШ БДУ, 1999. – 175 с.

12. Черных, А.П. Геральдика / А.П.Черных // Введение в специальные исторические дисциплины. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1990. – С. 40–80.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Вучэбная работа студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі заснавання і дзейнасці беларускіх музеяў.

Найбольш дзейснымі педагагічнымі методыкамі і тэхналогіямі, што накіроўваюць студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, садзейнічаюць набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавая, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, напісанні курсавой і дыпломнай работы па дадзенай дысцыпліне.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах курса, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да экзаменуі інш.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамену.